

# Прызентацыя на тэму: "Жыццё Васіля Быкава"

Падрыхтавана
настаўнікам беларускай мовы
СШ № 51
Пугач НАДЗЕЯ Андрэеўна

Нарадзіўся ў сялянскай сям'і 19 чэрвеня 1924 году ў вёсцы Бычкі Ушацкага раёну Віцебскай вобласці. . З дзяцінства захапляўся маляваннем. У 1939г. скончыў 8 класаў Кубліцкай СШ, паступіў на скульптурнае аддзяленне Віцебскага мастацкага вучылішча. Аднак восенню 1940 ў сувязі з пагаршэннем матэрыяльнага становішча сям'і і адменай дзяржаўных стыпендый вымушаны быў пакінуць вучобу.



Улетку 1942 быў прызваны ў Чырвоную Армію, скончыў Саратаўскае пяхотнае вучылішча (з 80 выпускнікоў у вайну ацалела толькі чацвёра). Увосень 1943 года прысвоена званне малодшага лейтэнанта. Ваяваў на Другім і Трэцім Украінскіх франтах, прайшоў па тэрыторыі Румыніі, Баўгарыі, Вэнгрыі, Югаславіі, Аўстрыі, двойчы быў паранены.

Падчас Кіраваградскай аперацыі паранены ў нагу і жывот (па памылцы быў запісаны як загінулы). Бацькі В. Быкава атрымалі ў 1944 г. паведамленне, што іх сын мужна загінуў у баях з нямецка-фашысцкімі захопнікамі каля Кіраваграда (гэта было засведчана на абеліску). Але В. Быкаў выжыў і ваяваў далей



У 1955 годзе канчаткова дэмабілізаваўшыся (маёр запаса), быў супрацоўнікам і кансультантам газеты «Гродзенская праўда». З 1978 г. жыве ў Мінску.



Творчая біяграфія пісьменніка пачынаецца ў пасляваенныя гады. Першыя апавяданні Васіля Быкава былі надрукаваны ў часопісе «Вожык» (1947, «Дапякло»), газеце «Гродзенская праўда» (1949, «У першым баі»).





У 1974 годзе Васіль Быкаў быў узнагароджаны Дзяржаўнай прэміяй СССР (за аповесць "Дажыць да світання", 1973).

У 1980 годзе атрымаў званне Народнага пісьменніка Беларусі.

У  1986 годзе –была прысуджана Ленінская прэмія за аповесць «Знак бяды».

Народны пісьменнік Беларусі Васіль Быкаў памёр 22 чэрвеня 2003 года ў 20 гадзін 30 хвілін у рэанімацыйным аддзяленні анкалагічнага шпіталю ў Бараўлянах, пад Мінскам.



Пахаваны ў Мінску на Усходніх могілках. Падчас пахавання быў адпеты ўніяцкімі святарамі, труну пісьменніка накрылі бел-чырвона-белым сцягам.

Адкрыццё надмагільнага помніка Васілю Быкаву адбылося
2 лістапада 2004 г. на мінскіх Усходніх могілках. Надмагільным помнікам Васілю Быкаву родныя і сябры абралі невялікі светлы валун, дар з Хельсінкі, на якім выбіты факсімільны подпіс пісьменніка і даты ягонага жыцця. На адкрыццё помніка прыйшло каля тысячы чалавек.



# Ушанаванне памяці

- У гонар пісьменніка названы вуліцы ў Гродне, Беластоку і пасёлку Ждановічы.
- У г. Віцебску ўсталявана мемарыяльная дошка па вуліцы Суворава, 15, на будынку дзіцячай мастацкай школы № 1 (у гэтым будынку з 1923 па 1941 знаходзілася Віцебскае мастацкае вучылішча, дзе з 1939 па 1940 вучыўся Васіль Быкаў).

# Музей
# Васіля Быкава

У 2012 была пачата работа па стварэнні музея Васіля Быкава. Музей адкрыты на базе дачы пісьменніка, размешчанай у пасёлку Ждановічы-6 Мінскага раёна.

Музей створаны як філіял Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры. Ажыццёўлены капітальны рамонт дачы з яе прыстасаваннем пад музейную ўстанову, добраўпарадкавана прылеглая тэрыторыя, створаны камфортныя ўмовы для наведвальнікаў.



# Музей
# Васіля Быкава

Для наведвальнікаў Музей Васіля Быкава адкрылі ў чэрвені 2014 да яго 90-годдзя.









[illegible]

[illegible]